**Вольга Бардзіян**
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (г. Мінск, Беларусь)*

# МОЎНАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ МАТЭРЫЯЛАЎ СТАЎБЦОЎСКАЙ РАЁННАЙ ГАЗЕТЫ «ПРАМЕНЬ»

Кожны раён, кожны населены пункт Рэспублікі Беларусь – гэта нед'емная частка жыцця ўсяго народа краіны, усіх яго здабыткаў, а разам з тым – асабістая крапатлівая жыццёвая сцяжынка кожнага чалавека. Галоўным каталізатарам у дзеянні можна лічыць рэгіянальную прэсу, якая адлюстроўвае на сваіх старонках рэальную гісторыю развіцця таго ці іншага рэгіёна краіны.

Грамадска-палітычная і інфармацыйна-рэкламная газета Стаўбцоўскага раёна «Прамень», заснавальнікамі якой з'яўляюцца Стаўбцоўскі раённы выканаўчы камітэт і Стаўбцоўскі раённы Савет дэпутатаў, з 4 снежня 2009 года выходзіць два разы на тыдзень, па серадах і суботах, ды і фарматам невялікая, ад 8 да 16 старонак, але кожны нумар газеты – гэта карціны жыцця і лёсы людзей маленькіх гарадоў і вёсак гэтага раёна. Можна адзначыць своеасаблівы праблемна-тэматычны спектр, жанравую, стылёвую і моўную палітру газеты. Безумоўна прыемным фактам з'яўляецца і тое, што яна цалкам беларускамоўная, хаця можна сустрэць матэрыялы і на рускай мове.

Трэба адзначыць, што тэматыка матэрыялаў на старонках газеты дастаткова шырокая і прэзентуецца, у першую чаргу, інфармацыйнымі жанрамі, а таксама аналітычнымі і мастацка-публіцыстычнымі, што выклікае цікавасць і прываблівае не толькі раённага чытача.

Вядома ж, культура публіцыстычнага тэксту вымагае ад журналіста адказнага стаўлення да падбору моўных сродкаў, якаснай апрацоўкі формаў выказванняў, што павінна станоўча адбівацца на ўсіх структурных адзінках газетнага матэрыялу. Без дасканалага ведання нормаў беларускай літаратурнай мовы нельга стварыць публіцыстычны твор, які б задаволіў чытача.

Пасля знаёмства з матэрыяламі газеты «Прамень» можна адзначыць даволі высокую маўленчую культуру, але ў кожным нумары сустракаецца парушэнне напісання дыграфаў «дз» і «дж», калі яны абазначаюць адзін гук, пры пераносе: «энергакалед-жа (№ 95, с. 4), год-зе» (№ 96, с. 4); перанос на другі радок «ў»: «тэрмін захо-ўвання, абслуго-ўванне» (№ 96, с. 3-4); таксама перанос апострафа на другі радок: «сям-'ёй» (96, с. 3); назіраецца вельмі частае парушэнне пра-

віла пераносу па складах: «ман-ікюры, пак-ідаюць, тэхналаг-ічныя» (№ 96, с. 3).

У матэрыялах газеты «Прамень» можна сустрэць і інтэрферэнтныя памылкі, пераважна аднанакіраваныя, руска-беларускія, у асноўным на лексічным узроўні: «Пастараемся *дастойна* сустрэць гасцей і на ўзроўні правесці гадавое свята хлебаробаў» (№ 96, с. 8); «Наша справа творчая, гэта *дастаўляе* вялікае задавальненне» (№ 96, с. 3). Нельга не звярнуць увагу і на няправільнае выкарыстанне лексем: «Важную ролю ў папярэджанні сямейнай нядобранадзейнасці *іграе* інфармацыйная работа» (№ 95, с. 4).

Інтэрферэнтнае парушэнне нормы на сінтаксічным узроўні ў асноўным выражаецца няправільным выкарыстаннем злучнікаў у складаных сказах: «У гэтай жа царкве для юных паломнікаў была падрыхтавана простая трапеза, *так як* ідзе Раджджэственскі пост» (№ 93, с. 8).

Падаецца, правільным было б выкарыстаць адзіную форму назоўніка на адной старонцы, хоць і ў розных матэрыялах: «…што асаблівым вопытам карыстаюцца штучныя ёлкі, ёлачныя *ўпрыгожанні*, маскарадныя навагоднія касцюмы» і «*Упрыгажэнне* інтэр'ера магазіна створыць прыемную атмасферу…» («№ 94, с. 1), нягледзячы на тое, што слоўнікі падаюць два гэтыя варыянты [1, с. 693].

Сустракаюцца і парушэнні ў выкарыстанні граматычных форм лексем. У сказе «Радасна назіраць, як кліент *палюбаваўся* сабою, *выказвае* шчырую ўдзячнасць» (№ 96, с. 3) замест дзеяслова *палюбаваўся* неабходна выкарыстаць дзеепрыслоўе *палюбаваўшыся*, каб вытрымаць правільную граматычную часавую форму ў выказванні.

Назіраем таксама выкарыстанне неўжывальнай ў беларускай мове формы дзеепрыметніка: «Як многа ўсяго перажывае *любячае* мацярынскае сэрца і як мала яму патрэбна?!» (№ 92, с. 9); «…якія выпускаюць гаспадарчыя тавары, *мыючыя* сродкі, а таксама парфюмерыю» (№ 94, с. 9). У першым выпадку неабходна замяніць дзеепрыметнікавую форму даданым сказам: «сэрца, *якое любіць…*», а ў другім – «*…сродкі для мыцця…*»

Можна паразважаць таксама і на тэму адлюстравання ў матэрыялах газеты фанетычнага закона «акання»: «У дакладзе старшыні раённага аб'яднання прафсаюзаў Юрыя *Ларычэва* была сканцэнтравана ўвага…» (№ 93, с. 4); «…Павел Буката, Уладзіслаў Мешчанчук, Вадзім *Жэрко* (Клецкі раён)…» (№ 92, с.2). Калі дапусціць, што прозвішча *Ларычэў* мае націск на «э», хаця гэта зусім неверагодна, то прозвішча *Жэрко* ніяк

не можа мець двух націскаў, значыць у адпаведнасці з правілам неабходна пісаць *Ларычаў* і *Жарко.*

Сустракаецца на старонках газеты і форма старажытнага плюсквамперфекта дзеяслова з нерэалізаваным вынікам: «Вольга Іванаўна прызнаецца, што яна ўжо *вырашыла была* пакінуць работу…» (№ 92, с. 4).

На старонках газеты шырока распавядаецца пра падзеі не толькі раённага маштаба, многа матэрыялаў прысвечана гісторыі і сучаснасці Рэспублікі Беларусь. Характэрным з'яўляецца і тое, што за кожным фактам, расповедам стаяць асабістыя поспехі і дасягненні канкрэтных асоб. Важную ролю ў падачы матэрыялу адыгрывае афармленне газетных палос. Знаёмства чытача з газетай звычайна пачынаецца са зрокавага успрымання, і таму афармленне першай старонкі мае вялікае значэнне. Амаль кожны нумар прыцягвае ўвагу невялікімі тэкставымі элементамі, цікавымі анонсамі, тэматычнымі фатакарткамі, выразнымі загалоўкамі і рознакаляровым афармленнем.

Падкрэсліваюць думку аўтара матэрыялу і надаюць жаданне пазнаёміцца з яго зместам такія вербальныя элементы, як загаловачны комплекс: загаловак, падзагаловак, лід. Немалаважную ролю адыгрываюць і рубрыкі газеты, якія аб'ядноўваюць матэрылы палос у адзінае цэлае. З даследавання матэрыялаў дзесяці нумароў газеты можна сцвярджаць, што загалоўкі вызначаюцца выразнасцю і адлюстроўваюць асноўную думку аўтара або трапна абазначаюць тэму. Ліды ў асноўным выдзелены колерам і стымулююць чытача на паглыбленае знаёмства з матэрыялам. Зразумела, што загалоўкі ўсё ж на чытача больш ўплываюць, чым сам тэкст, і ў гэтым павінна праяўляцца аўтарскае майстэрства ўлічыць усе магчымыя лінгвастылістычныя асаблівасці падчас пабудовы граматычнай структуры загалоўка. У газеце «Прамень», на наш погляд, пераважаюць загалоўкі намінатыўнага характару: *Дзіцячы доктар, Дзень нараджэння Лёсіка* (№ 92); *Віктарына на мове бяспекі, Перадсвяточны гандаль* (№ 93); *Лепшы вучань года, Каляд чароўныя імгненні* (№ 96). У арганізацыі такіх канструкцый вялікая роля належыць семантыцы найменя з'явы, падзеі, што падкрэслівае актуальнасць знаёмства чытача з матэрыялам.

Недзе ў аднолькавых прапорцыях выкарыстаны аўтарамі загалоўкі ў выглядзе сінтаксічных канструкцый простага і няпоўнага сказа. Напрыклад, на другой старонцы газеты за № 92 пад рубрыкай «Навіны Стаўбцоўшчыны» палова матэрыялаў прадстаўлена такімі загалоўкамі: *У Стоўбцах будуць наваселлі, Ідэі прапануюць маладыя, Выбар робіць*

*кожны*. Зразумела ж, калі інфармацыя падаецца кароткай заметкай, то і тэма адпаведна выражаецца дакладна і ў некаторай ступені поўна, хаця, як бачым, загалоўкі інтрыгуюць чытача дазнацца больш дэталёва аб прапанаваных навінах.

Цікавасць выклікаюць і канструкцыі з пытальнай інтанацыяй, прычым у большасці з іх адсутнічае графічны знак пытання, але ў наяўнасці пытальнае слова: *Каго чакае пяцікратны штраф* (№ 92). Параўнаем: *Ці камфортна на рабочым месцы?* (№ 94). У першым выпадку пытальная інтанацыя загалоўка вымушае задумацца і нейкім чынам псіхалагічна рыхтуе чытача да ўспрыняцця інфармацыі, у сваю чаргу графічна ў цэнтры матэрыялу змешчаны тэкставы элемент, які па змесце зноў жа вымушае хутчэй дазнацца адказ. Загаловак жа з графічным знакам заклікае чытача адказаць, а перад гэтым прачытаць, што маецца на ўвазе, ці тычыцца гэтае пытанне яго?! Такім чынам, можна сказаць, што аўтары абдумваюць усе нюансы свайго матэрыялу на карысць і выдання, і чытача.

Не менш цікава падаюцца матэрыялы і загалоўкамі ў выглядзе няпоўных: *З наведваннем рэзідэнцыі Дзеда Мароза, Колер настрою – сіні, Прафсаюзы – дзецям* (№ 94); адвербіяльных: *Абараняць Радзіму вучаць і дзяўчат* (№ 95); эліптычных: *З новымі ведамі – наперад* (№ 93) і інфінітыўных: *Прыехаць і застацца, Дарыць шчасце пад Новы год* (№ 92) сінтаксічных канструкцый. Канструяванне публіцыстычнага тэксту адбываецца ў адпаведнасці з аўтарскай задумай, выбар неабходнага моўнага матэрыялу і афармленне сінтаксічных адзінак вызначае адносіны аўтара да фактаў, якія апісваюцца ім, дапамагае больш глыбока асэнсаваць, даступна і цікава падаць думку чытачу.

Падаецца, што рэдакцыя газеты «Прамень» абапіраецца на не зусім вялікі штатны журналісцкі актыў, бо з нумара ў нумар выступаюць са сваімі матэрыяламі, нават па некалькі разоў, адны і тыя ж супрацоўнікі. Амаль у кожным нумары прадстаўлены аўтарскія матэрыялы прадстаўнікоў розных арганізацый.

Станоўчым можна лічыць і той факт, што акрамя вядучых рубрык *Родны край, Год малой Радзімы, Медыцына, Соцыум, Жывёлагадоўля, Прафесіяналізм, Творчасць* і інш., у газеце некалькі старонак адводзіцца такім рубрыкам, як *Віншаванні, Аб’явы, Рэклама, Калейдаскоп*. Усё гэта з’яўляецца добрым паказчыкам клопату пра чалавека, плённай працы рэдакцыі газеты, якая на багатым фактычным матэрыяле выхоўвае сучасніка розных пакаленняў, дае магчымасць кожнаму рэальна ацаніць

яго ролю ў развіцці свайго раёна і Рэспублікі Беларусь, бо без усякага сумнення героем усіх падзей па жыцці быў, ёсць і будзе заставацца чалавек працы.

*Бібліяграфічныя спасылкі*

1. Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы: Больш за 5 000 слоў / пад рэд. М. Р. Судніка, М. Н. Крыўко; афармленне А. М. Хількевіча. – Мінск : БелЭн. 1996. – 784 с.

**Анна Басова**
*Белорусский государственный университет (г. Минск, Беларусь)*

# ДОПОЛНИТЕЛЬНОЕ ОБРАЗОВАНИЕ ЖУРНАЛИСТСКИХ КАДРОВ КАК ФАКТОР РАЗВИТИЯ ГОСУДАРСТВА В ЦИФРОВУЮ ЭПОХУ

Определяющим фактором конкурентоспособности любого государства является уровень образованности и интеллектуального потенциала его граждан. Дополнительное образование взрослых в Республике Беларусь – один из важнейших факторов социально-экономического развития государства и представляет собой гибкую, мобильную и постоянно развивающуюся систему, призванную решать задачи обеспечения страны профессиональными кадрами требуемого уровня квалификации. Оно обладает рядом характеристик и преимуществ: открытость и доступность, эффективная поддержка слушателей, гарантия высокого качества обучения, внедрение образовательных программ на основе информационно-коммуникационных технологий.

В современных условиях производство, распространение и потребление медиапродукции осуществляется на высоком уровне с применением все более совершенных технических средств и наукоемких технологий. За счет этого в сфере массовой информации не только происходят технологические и организационные преобразования, но и возникают новые медиаструктуры, расширяется их взаимопроникновение и взаимодействие с другими системами. Особенно необходимы специалисты для таких сфер профессиональной деятельности индустрии СМИ, как общий и финансовый менеджмент, сопровождение интернет-СМИ, продвижение СМИ и совершенствование технологий продаж, повышение качества дизайна, правовая и этическая культура журналистов, привлечение рекламы, совершенствование контента, тематической модели СМИ и технологии работы с информацией и др. Развитие и динамика